Што да Аляксандра Казуліна, то я да яго стаўлюся з вялікай павагай. Таму лічу некарэктным цяпер абмяркоўваць мэтазгоднасць і выніковасць ягоных дзеянняў. Хаця, калі Вы задалі такое пытанне, можна сказаць і пра тое, што "дапамагалі" яму далёка не заўсёды ўдала. Узяць хаця б тую недарэчнасць з подпісамі за рух "Воля народа", да якой спрычынілася і ваша паважаная газета.

— Некалькі гадоў таму Вы ўзначалілі Раду беларускай інтэлігенцыі, але пра дзейнасць гэтай арганізацыі амаль нічога не чуваць. Існуе яна сёння, ці, можа, ужо створана штосьці новае?

— Мы рэгулярна збіраемся на пасяджэнні, абмяркоўваем становішча ў краіне, фармулюем сваю пазіцыю па найбольш актуальных праблемах і даводзім сваю думку да беларускай і міжнароднай грамадскасці. Але апошняе рабіць усё цяжэй у сувязі з інфармацыйнай сітуацыяй у Беларусі. Дасылаем свае адозвы і да вельмі паважанай "Народнай волі", але вашая газета чамусьці іх не друкуе. Тым не менш мы атрымліваем адказы ад урадаў і міжнародных арганізацый Еўрапейскага Саюза і ЗША. І вынікі ад гэтай дзейнасці, паверце, ёсць. Напрыклад, знайшла падтрымку і рэальнае ўвасабленне ідэя сустрэчы прадстаўнікоў інтэлігенцыі краін былога СССР, якую мы прапанавалі зрабіць у Белавежскай пушчы яшчэ ў 2003 годзе. Нядаўна я вярнуўся з Віленскага форуму, дзе ўжо ў чацвёрты раз збіраюцца прадстаўнікі інтэлігенцыі краін былога СССР. Адбываецца гэта ў палацы прэзідэнта Літвы Адамкуса. Сам ён таксама часам далучаецца да нас, каб папіць кавы і паразмаўляць. І кажа вельмі разумныя рэчы. Часам прыходзіць не адзін, а ў кампаніі з тымі, хто на той час у яго гасцюе. Напрыклад, з прэзідэнтам Польшчы Качыньскім ці прэзідэнтам Украіны Юшчанкам. Але самае важнае ў гэтых форумах — гэта магчымасць нефармальных кантактаў паміж інтэлігенцыяй, абмену досведам і інфармацыяй пра тое, што насамрэч адбываецца ў нашых краінах. Аналагічны форум інтэлігенцыі быў заснаваны летам 2005 года ў Маскве пад патранатам прэзідэнта Расіі Пуціна. І я таксама браў у ім удзел. Што да вынікаў такіх сустрэч, то яны, безумоўна, імгненна не "выратуюць Беларусь". Але ў рэшце рэшт абавязкова і няўхільна выведуць нашы краіны на правільны цывілізаваны шлях.

— Спадар Уладзімір, не магу не пацікавіцца пра справы Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя. Колькі ў ім сёння навучэнцаў? Ці лічыце Вы, што ў навучальнай установе адбываецца паўнавартасны навучальны працэс? Усё ж такі сучасныя адукацыйныя крытэрыі маюць на ўвазе адпаведную матэрыяльна-тэхнічную базу, абсталяванне і г.д. Ёсць меркаванне, што коласаўскі ліцэй ператварыўся ў палітычны фетыш...

— Выбачайце, але не магу не адзначыць нядобразычлівасці, якой працятыя ўсе Вашы пытанні... Хаця здагадваюся пра прычыны гэткай інтанацыі.

Коласаўскі ліцэй працуе і будзе працаваць. Гэта падабаецца далёка не ўсім. Але мы не саступілі і не саступім са сваіх пазіцый. Я маю на ўвазе ўзровень і змест навучання. І тое, што моладзь, якая трапіла ў ліцэй, адтуль ужо, як кажуць, колам не выгнаць. Вядома нам і пра намеры абліць брудам і ліцэй, і тых, хто ў ім працуе. І пра імкненне раскалоць нас, справакаваць паміж намі міжусобную грызню і выплюхнуць гэта на старонкі прэсы. Гэта будзе яшчэ адна перамога тых сіл, якія, у адрозненне ад дэмакратаў, добра скансалідаваныя, дысцыплінаваныя і не абмежаваныя маральнымі нормамі. Гэта значыць, здольныя на любую хлусню і любую подласць. Таму раю Вам не танчыць пад іхнюю дудку. Сёння ліцэй сапраўды перажывае далёка не лепшыя свае часы. Мы вельмі ўдзячныя "Народнай волі" за падтрымку і разуменне важнасці місіі ліцэя. І цудоўна разумеем ступень уласнай адказнасці за тое, што робім. Вельмі спадзяюся на тое, што і ў новым 2007 годзе мы будзем разам, плячом да пляча, пакінуўшы ў мінуўшым годзе цяжар недаверу і непаразуменняў, якія, магчыма, накапіліся паміж намі. Зычу "Народнай волі" ў новым годзе творчага плёну, імгненнага распаўсюду і пашырэння кола чытачоў. А чытачам — здароўя, духоўнай моцы і плёну ў добрых справах.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

АД РЭДАКЦЫІ

Спадар Уладзімір!

"Народная воля" ўдзячна Вам за шчырыя адказы. Як і за тое, што Вы "вельмі ўдзячны "Народнай волі" за падтрымку і разуменне важнаці місіі ліцэя".

Але, прабачце, нам незразумела, пра які "цяжар недаверу і непаразуменняў, якія, мачыма, накапіліся паміж намі", Вы гаворыце? Незразумела і тое, чаму Вы з нейкай нервознасцю ўспрымаеце нашы пытанні наконт Вашай перамогі на парламенцкіх выбарах. Фактычна Вы ж самі падсумавалі: "І надалей будуць "абуваць", калі мы будзем згаджацца гуляць па гэтых правілах". Дык не гуляйце, шаноўны спадар Уладзімір! Мала звярнуцца з заявай у Цэнтрвыбаркам ці пракуратуру. Ёсць дзесяткі іншых законных дзеянняў, якія здольны прымусіць улады прывесці ўсё ў адпаведнасць з заканадаўствам. Падумайце, ці ўсё Вы зрабілі, што маглі зрабіць. І не забывайце, што на талерачцы з блакітным абадочкам ніхто Вам перамогу не прынясе.

Хочацца спадзявацца, што 2007-ы здыме непаразуменні і прынясе добры плён як Вам, так і "Народнай волі".

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

"Не могли бы Вы более подробно рассказать о спецслужбе, которая находится под крылом Комитета погранвойск? Меня интересует: правда ли, что ее возглавляет один из сыновей Александра Лукашенко, служивший в погранвойсках? Если да, то как давно?"

Александр КУПЦОВ, Витебская область.

Не возглавляет, а курирует...



Отдельную службу активных мероприятий (ОСАМ) Госкомитета погранвойск возглавляет полковник **Игорь Рачковский.** Его назначили на эту должность около двух лет назад. Раньше Игорь Анатольевич работал заместителем начальника ОСАМа, до этого — майор Рачковский являлся начальником отдела войсковой части 1250.

20 сентября 1999 года А.Лукашенко своим указом наградил Рачковского *"За образцовое исполнение воинского долга и особые заслуги в охране государственной границы"*. Полковничьи погоны Рачковский получил 8 июня 2005 года (руководителем ОСАМа Игоря Анатольевича назначили, когда он был майором).

После назначения Игоря Рачковского начальником ОСАМа в Интернете писали, что под его руководством в погранвойсках служил старший сын Лукашенко Виктор. Правда это или нет — точно неизвестно. По неофициальной информации известно другое: сегодня **Виктор Лукашенко** как помощник президента по вопросам национальной безопасности лично курирует деятельность некоторых спецслужб, в том числе и ОСАМа.

Любопытно, что Александр Лукашенко встречался с начальником ОСАМа лишь однажды — сразу после вступления Рачковского в должность. Во всяком случае так сообщает президентская пресс-служба.

"Рачковский доложил главе государства обстановку на государственной границе, об особенностях работы пограничных служб в условиях вызовов современности, — говорится в сообщении пресс-службы. — *Президент потребовал обеспечить безопасность государственной границы, прежде всего в сфере борьбы с криминалом, поставил задачу осуществлять жесткий контроль за пограничными и таможенными подразделениями.*

Александр Лукашенко также дал ряд конкретных поручений, касающихся обеспечения интересов государства на границе, вопросов борьбы с торговлей людьми и контрабандой".

А не так давно на одном из сайтов написали, что ОСАМу якобы *"переданы задачи по активному участию в борьбе с оппозицией"*, а также *"функции по разработке и проведению спецопераций по отношению к иностранным гостям, включая провокации, задержания, выдворения из страны"*.

Можно ли верить этой информации — сказать сложно. Сотрудники Комитета погранвойск категорически отказываются разговаривать об ОСАМе. Почему — можно только догадываться.

Марина КОКТЫШ.

СЛЫШАЛИ?

Мини-амнистия

Накануне Нового года на армейских гарнизонных гауптвахтах была объявлена амнистия. Об этом "Интерфаксу" сообщил главный военный комендант Вооруженных сил Беларуси полковник Анатолий Грицев.

Собеседник агентства уточнил, что с гауптвахты освобождены "только дисциплинарно арестованные военнослужащие, но не освобождаются те, кто отбывает наказание по решению судов".

Главный военный комендант Вооруженных сил отметил, что чаще всего военнослужащие подвергаются арестам за такие проступки, как самовольные отлучки из расположения частей, употребление спиртных напитков и другие нарушения воинской дисциплины.

КАДРЫ

А што за кадры?

Традыцыйна напрыканцы года Аляксандр Лукашэнка падпісвае кадравыя ўказы. Так адбылося і на гэты раз.

Як паведамляе прэс-служба прэзідэнта, А.Лукашэнка прызначыў:

Раісу САЎРЫЦКУЮ — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю (раней таксама працавала ў КДК), **Сяргея БАРАНОЎСКАГА** — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, дырэктарам Дэпартамента фінансавых расследаванняў (раней узначальваў упраўленне дэпартамента па Брэсцкай вобласці), **Аляксандра БІНЕЦКАГА** — намеснікам старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі (кіраваў фінансамі на СТБ), **Алега ПАФЕРАВА** — намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта (былы камандуючы войскамі проціпаветранай абароны).

А.Лукашэнка таксама даў згоду на шэраг прызначэнняў: **Ігара ПРАКАПЕНКІ** — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, **Уладзіслава ЦЫДЗІКА** — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці, **Уладзіміра ЗАМЯТАЛІНА** — генеральным дырэктарам рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", **Уладзіміра МАЛЬЦА** — намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва, **Марыяны ШЧОТКІНАЙ** — намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны, **Уладзіміра АМАРЫНА** — намеснікам міністра фінансаў, **Аляксандра БІЛЕЙЧЫКА** — намеснікам міністра юстыцыі, **Івана ШЧЭРБЫ** — намеснікам міністра транспарту і камунікацый, **Валерыя СТРАМУКА** — намеснікам начальніка Беларускай чыгункі, **Леаніда АПАНАСЮКА** — старшынёй Жлобінскага райвыканкама, **Віктара ГАМОЛКІ** — старшынёй Лельчыцкага райвыканкама, **Дзмітрыя БАНОХАВА** — старшынёй Бабруйскага гарвыканкама, **Сяргея ХМАРУКА** — пракурорам Брэсцкай вобласці, **Аляксандра ЛЯХАВА** — генеральным дырэктарам рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Вытворчае аб'яднанне "Беларуснафта".

Ул.інф.

ПОЛИТКУХНЯ

А был ли мальчик?

Кампания по выборам в местные Советы в самом разгаре. Увы, нет среди кандидатов многих лидеров оппозиции, чьи инициативные группы отказались регистрировать. 1-й секретарь Партии коммунистов Белорусской ***Сергей КАЛЯКИН,*** *который "шел" в Минский городской Совет, — в том числе.*

Сергея Ивановича якобы подставили студенты, которые вначале вошли в его инициативную группу, а затем написали заявления о том, что были включены туда без их ведома. Мы решили найти этих самих студентов, хотя это оказалось еще труднее, чем избраться в горсовет.

Перво-наперво корреспондент "Народной воли" попытался найти "концы" у заместителя председателя окружной избирательной комиссии Куйбышевского избирательного округа N-42 г.Минска **Галины Конопацкой**. Вот дословный диалог:

— Да, Сергею Ивановичу Калякину было отказано в регистрации его инициативной группы, потому что он включил в эту группу молодых детей, которые вообще даже не знали, что их туда включили, — отчеканила мне Галина Конопацкая. — Это были девочки, которым только исполнилось по восемнадцать лет, и они были просто в шоке от того, что их включили в эту инициативную группу. Они не давали на это своего согласия.

— Это студенты?

— Да, это студенты. Которым буквально в ноябре только исполнилось восемнадцать лет.

— Можно узнать их фамилии?

— Как это мы вам дадим фамилии этих девочек?.. Возьмите у Калякина, у вас же есть Калякин, зачем я вам должна что-то предоставлять?.. И вообще, по закону мы не обязаны предоставлять вам никакие фамилии.

По совету госпожи Конопацкой мы обратились затем и к **Сергею Калякину**, но в ответ на просьбу связать нас с этими студентками услышали уже о студентах: *"Не хотят хлопцы общаться... На них так хорошо "наехали", что они вообще не хотят общаться. У нас всего в инициативной группе было десять человек, из них, по-моему, четверо — студенты. Троих нашли, которые отказались. Для них это оказалось достаточным, чтобы отказать в регистрации. Но в группе вообще ведь может быть всего три человека".*

Итак, получается, что "отфутболили" нас и в избирательной комиссии, не помог и Сергей Иванович. Может, истина никому и не нужна? Может, и не нужно искать ответа на вопрос "Зачем вообще включать в свою инициативную группу людей, которые завтра могут от вас отречься?". А мальчики там или девочки — это уже совсем другой вопрос. И вообще, как писал классик: "А был ли мальчик?"

Александр ФЕДОРОВ.

СКАНДАЛ

Беларускія ўлады выставілі польскіх ксяндзоў

Вернікі вёскі Лаздуны на гэтае рашэнне адказалі галадоўкай і заявілі, што будуць і ў 2007 годзе дабівацца вяртання святара ў сваю парафію.

2006 год для Каталіцкага касцёла Беларусі стаў бадай што самым няпростым за мінулае дзесяцігоддзе. Дзве акцыі пратэсту на працягу аднаго месяца красамоўна сведчаць пра тое, што Касцёл на Беларусі перажывае не самыя лепшыя часы. На пачатку снежня 2006 года вернікі парафіі Маці Божай Вострабрамскай у Гродне ў выніку галадоўкі дамагліся ад аблвыканкама дазволу на будаўніцтва новага касцёла. Напярэдадні Новага года трое сутак галадалі парафіяне касцёла ў вёсках Лаздуны і Юраціішкі, што на Гродзеншчыне. Яны пратэставалі супраць рашэння ўлад па сутнасці высылаць з Беларусі сем польскіх ксяндзоў і пяць манашак. Ім без усялякіх тлумачэнняў адмовілі ў візе на 2007 год. Заявы беларускага боку, што, маўляў, каталіцкіх святароў выхоўваюць на Беларусі, а значыць, і ў парафіі трэба накіроўваць ксяндзоў беларускага паходжання, на практыцы выглядаюць не так пераканаўча. Каля 30 парафій дыяцэзіі і па сёння не маюць сваіх святароў. Епіскап увесь час вымушаны звяртацца да уладаў з просьбай аб рэгістрацыі замежных духоўнікаў.

У спіс "неўязных", які быў агалошаны напярэдадні Калядных свят, трапіў і ксёндз касцёла вёскі Лаздуны Іўеўскага раёна Мар'юш Ільяшэвіч. Ён 13 год служыў у Беларусі. Парафіяне, даведаўшыся пра гэтае рашэнне, сабралі каля 12 тысяч подпісаў у абарону свайго святара і накіравалі дэлегацыю ў Мінск да старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальных меншасцяў Анатоля Гулякі. Вернікам абяцалі ва ўсім разабрацца і даць адпаведны адказ. Ліст з камітэта ў Лаздуны прыйшоў напярэдадні Новага года. Мар'юшу Ільяшэвічу не дазволілі працаваць у Беларусі, як і ўсім тым, хто трапіў у чорны спіс. Трое парафіян гэтага касцёла амаль адразу ж абвясцілі бестэрміновую галадоўку. На наступны дзень галадаючых было ўжо каля 100 чалавек: да галадоўшчыкаў далучыліся таксама вернікі вёскі Юраціішкі. Парафіяне шчыра здзіўляліся, дзе і як магло нарадзіцца рашэнне высылаць з краіны ксяндза Ільяшэвіча. Ён, сцвярджалі вернікі, паляк па пашпарце, а ў душы — беларус. Маці ксяндза — беларуска, ягоны бацька вызваляў Беларусь ад нямецкіх захопнікаў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Але на гэты раз пераканаць беларускія ўлады не ўдалося. 31 снежня ксёндз Ільяшэвіч вымушаны быў пакінуць Беларусь. На развітальнай імшы ён звярнуўся да сваіх парафіян з просьбай спыніць галадоўку.

Крыху раней, літаральна за тыдзень да Калядных святаў, у касцёлах Гродзеншчыны падчас імшы зачытвалася пасланне кіраўніка Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі Аляксандра Кашкевіча з нагоды рашэння беларускіх улад не падаўжаць візу для каталіцкіх святароў на 2007 год. Зварот біскупа быў вытрыманы ў даволі жорсткай форме. Што стала нечаканым — Касцёл на Беларусі звычайна імкнуўся не абвастраць адносіны з дзеючай уладай. Біскуп Кашкевіч патлумачыў свой "смутак і пратэст" так:

"Улада ў касцёле, згодна з правам усеагульнага касцёла, належыць біскупу, — сказаў Аляксандр Кашкевіч. — Заканадаўства нашай краіны таксама пакідае дыяцэзіяльнаму біскупу свабоду выбару пры запрашэнні на працу грамадзян іншых краін. Таму знешняе ўмяшанне ў правамоцную дзейнасць дыяцэзіяльнага біскупа з'яўляецца парушэннем закону і парушэннем свабоды касцёла".

Біскуп Аляксандр Кашкевіч афіцыйна звярнуўся і ў Адміністрацыю прэзідэнта з просьбай разабрацца ў сітуацыі, якая склалася вакол ксяндзоў польскага паходжання. Але адказу з прэзідэнцкай стактуры ў мінулым годзе так і не атрымаў.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

На фота: *За свае правы каталікі в.Лаздуны маюць намер змагацца і ў гэтым годзе.*

З-ЗА КРАТАЎ

«Гэта сапраўды годны, мужны чалавек»

Прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч адчувае сябе нармальна, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску журналістам грамадскі актывіст Цімафей Дранчук. Цімафей і Мікалай разам адбывалі пакаранне ў папраўчай калоніі № 1.

Гэты здымак архіўны. І, вядома, Мікалай Аўтуховіч зараз адчувае сябе не так, як на свабодзе. Але пажадаем яму хутчэйшага вяртання з-за кратаў.

Паводле слоў Ц.Дранчука, ён бачыў М.Аўтуховіча 25 снежня. "Калі яго перавялі да нас, ён выглядаў вельмі кепска, паколькі спраўляўся з наступствамі галадовак, якія ён перанёс. Але цяпер ён адчувае сябе нармальна. За час яго знаходжання ў калоніі мы з ім размаўлялі практычна кожны дзень", — сказаў Ц.Дранчук.

Актывіст заклікаў падтрымаць М.Аўтуховіча: "Трэба пісаць яму лісты, пасылаць паштоўкі. Яго барацьба яшчэ не скончана, у яго дагэтуль спрабуюць канфіскаваць нейкую маёмасць. Ён прасіў, каб яго справу не пакідалі без увагі. Гэта сапраўды годны, мужны чалавек".

М.Аўтуховіч, нагадаем, прызнаны вінаватым ва ўхіленні ад выплаты падаткаў і ў ажыццяўленні перавозкі пасажыраў і багажу без рэгістрацыі камерцыйнай фірмы, у выніку чаго гарадскі бюджэт панёс страты ў асабліва буйным памеры.

Трэба адзначыць, што яшчэ ў 2004 годзе ўлады мелі намер аштрафаваць Аўтуховіча на суму больш за 700 млн рублёў, аднак прэзідыум Вышэйшага Гаспадарчага суда Беларусі адмяніў рашэнні аб спагнанні штрафаў і накіраваў справу прадпрымальніка на новы разгляд. Нягледзячы на гэта, 14 кастрычніка 2005 года Аўтуховіч быў арыштаваны ў Гродне. Яго змясцілі ў следчы ізалятар, дзе ў знак пратэсту прадпрымальнік аб'явіў галадоўку — яна цягнулася 74 дні. У снежні таго ж года Аўтуховічу змянілі меру стрымання — з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе і перавялі па месцы жыхарства ў Ваўкавыск (Гродзенская вобласць), аднак у пачатку лютага абвінавачаны знік з-пад дамашняга арышту. Яго знайшлі ў Мінску 8 красавіка, і з тых пор ён знаходзіцца пад вартай.

Сяргей ПУЛЬША.

Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ТЕМА ДНЯ

Газовая схватка: кто выиграл?

(Продолжение. Начало на 1-й стр.)

Почему так вцепились в «Белтрансгаз»?

"Ответ прост, и именно о нем шла речь и на переговорах в Кремле. Впрочем, как и на многих других предшествующих встречах. Ответ называется "Белтрансгаз", то есть инфраструктура транспортировки энергоресурсов. С точки зрения поставок в Европу эта ветка не так загружена, как украинская, однако обладание ею дает массу козырей. В том числе и в переговорах с той же Украиной.

С "Белтрансгазом" в последние годы увязывается все: и существование так называемого Союзного государства, и цена на газ, которую Беларусь будет платить. Позволить "Белтрансгазу" стать совместным с Россией предприятием (то есть отказаться от части своих суверенных прав на него) может только Лукашенко.

Прелесть ситуации в том, что, как только он это сделает, интерес Москвы к его поддержке резко упадет. Видимо, белорусский президент это понимает: он манит обещаниями, он говорит, что все будет, но официально оформить отношения не спешит, даже под угрозой перекрытого вентиля. Он знает: пока он не отдаст свое главное сокровище, Москва его не бросит".

Известия.ru

"Еще один вопрос, по которому сумели договориться Беларусь и "Газпром", — раздел "Белтрансгаза". Это предприятие владеет газораспределительными сетями в Беларуси и представляет для российской монополии особую ценность — получив "Белтрансгаз" во владение, "Газпром" сможет экономить на транспортировке своего топлива в Европу.

Через четыре года во владении у "Газпрома" окажется половина "Белтрансгаза". Российская монополия заплатит за нее 2,5 миллиарда долларов, причем растянет платежи на все четыре года".

Lenta.ru

КОММЕНТАРИЙ

Это однозначно девальвация рубля, инфляция

"Если просто посчитать, то в 2006 году мы за газ заплатили чуть меньше миллиарда долларов, в 2007-м нам надо будет заплатить чуть больше 2 миллиардов, — заметил руководитель исследовательского центра Мизеса экономист Ярослав Романчук. — С учетом повышения стоимости транзита, а также с учетом того, что в 2007 году мы должны будем получить 625 миллионов долларов компенсации — первый транш "Газпрома", разница составит чуть меньше полумиллиарда долларов".

По мнению Романчука, в принципе это цена, которая "вполне подъемна" для белорусской экономики. Однако, как он считает, потери от изменения цены на газ следует рассматривать вместе с изменением правил поставок российской нефти в Беларусь и новым форматом российско-белорусских экономических отношений в целом. В этом случае общие потери для Беларуси составят около 4 миллиардов долларов в год. А это, считает эксперт, "очень болезненный удар по торговому балансу".

"Это однозначно девальвация рубля, инфляция, необходимость перекройки бюджета уже в январе, — подчеркнул Романчук. — *То есть самый худший сценарий относительно того, как Беларусь может справиться с энергетическим кризисом, к сожалению, оправдывается".*

Андрей АЛЕХНОВИЧ.
"Немецкая волна".

В ЗЕРКАЛЕ ПРЕССЫ

Плата за лояльность

У Лукашенко и его подчиненных была какая-то непрошибаемая уверенность в том, что газ не подорожает.

"К повышению готовы, но только чтобы цены были на уровне соседней Смоленской области", — заявляли высокопоставленные чиновники. Складывалось впечатление, что Беларусь тоже является областью в составе России. Однако Союзного государства как не было, так и нет. Про единый рубль в Минске и не вспоминают. Так что же нас объединяет, кроме слов о Союзе? *"Лукашенко рассчитывал, что Москва будет и дальше оплачивать его лояльность, если он ругает американцев, это должно оплачиваться. Но это никак не стоит 2—3 млрд долларов в год, — заявил "Известиям" источник в правительстве. — Если учесть еще и поставки нефти и сахара, то ежегодная поддержка союзного Минска оценивается Москвой примерно в 5 млрд" долларов.*

Известия.ru

Аннексия Беларуси даст Путину законные основания остаться в Кремле

Некоторые эксперты убеждены, что в деле замешаны более прихотливые мотивы, чем откровенная жажда наживы. Речь идет о включении Беларуси в состав Российской Федерации…

Путину не придется посылать войска для расширения Российской Федерации. Он использует повышение тарифов, чтобы вынудить Лукашенко признать российский рубль единственной валютой Беларуси. Более того, Путин хочет, чтобы Лукашенко прекратил ставить палки в колеса Союзному государству России и Беларуси и подписал в 2007 году конституционное соглашение, влекущее за собой формальное включение Беларуси в состав Российской Федерации. Это позволит Путину стать первым собирателем славянских земель, утраченных предыдущими московскими руководителями — Михаилом Горбачевым и Борисом Ельциным. Кроме того, аннексия Беларуси даст Путину законные основания остаться в Кремле, если так ему будет угодно. Это будет его первый конституционный срок на посту президента нового союзного государства вместо третьего — неконституционного — срока на его нынешнем посту.

Time.

Европа и пальцем не пошевелит

Главную роль в этом деле сыграли политические соображения. "Газпром", находящийся под контролем государства, не более чем послушный исполнитель воли Кремля.

Долгое время в Москве предавались иллюзиям о том, что властолюбивого Лукашенко можно побудить к созданию федеративного государства в составе России и Беларуси. Такой союз был бы в интересах России, так как в результате объединения обоих государств российские границы вплотную приблизились бы к территории НАТО и ЕС.

Проблема в том, что деспот экономически слабой Беларуси хотел бы возглавить новое государственное образование на равных с президентом России, которому не занимать самоуверенности и кассы которого набиты деньгами. Это ничего хорошего не сулит.

Повышение цен на газ — мощный сигнал, адресованный Лукашенко. Если белорусский президент не согласится образовать федерацию с Россией на условиях, продиктованных Кремлем, то дни его сочтены. Тем более что репутацией у себя в стране Лукашенко обязан главным образом дешевым поставкам российского газа. Если этот источник иссякнет, то и карьера бывшего директора совхоза на этом завершится. Европа, как отлично понимают в Москве, и пальцем не пошевелит, чтобы спасти последнего диктатора на европейском континенте.

Die Welt.

У Гавану

Першая партыя аўтобусаў МАЗа прыбудзе ў порт Гаваны на пачатку 2007 года. Пра гэта заявіў пасол Кубы ў Беларусі Амар Медына Кінтэра.

Паводле інфармацыі цэнтра грамадскіх сувязяў Мінскага аўтамабільнага завода, прадпрыемства плануе паставіць у сталіцу Кубы 50 гарадскіх аўтобусаў "МАЗ-107" з нізкай падлогай і 50 гарадскіх аўтобусаў асабліва вялікай умяшчальнасці "МАЗ-105". Усю партыю гарадскога транспарту плануецца перадаць у Гавану да чэрвеня 2007 года. На прадпрыемстве зазначылі, што Мінскі аўтазавод вырабляе для кубінскіх замоўцаў не толькі аўтобусы. У кастрычніку 2006 года МАЗ ужо паставіў у гэтую краіну шэсць аўтакранаў, два самазвалы і запасныя часткі да іх.

Міжнародныя эксперты прызналі Беларусь найгоршай краінай для падаткаплацельшчыкаў

Найлепшая краіна для падаткаплацельшчыкаў — Мальдывы, найгоршая — Беларусь. Такую выснову робіць у сваім дакладзе Сусветны банк і аўдытарска-кансалтынгавая група "PricewaterhouseCoopers", якія прааналізавалі ўзровень падатковых ставак і метады збірання падаткаў, паведамляе расійская газета "Ведомости".

Яны даследавалі 175 падатковых сістэм свету. Ацэньвалі іх па крытэрыях узроўню падатковага цяжару, прастаты заканадаўства, часавых затрат на ўплату падаткаў і іх колькасці.

Галоўная праблема падатковых законаў — іх складанасць і заблытанасць, лічаць аўтары даклада. У 2005 годзе кожная фірма ў свеце прадставіла ў сярэднім 35 старонак падатковых дэкларацый (ад 175 старонак у Камеруне да 17 у Аўстраліі). Рэйтынг па ўсіх паказчыках узначальваюць Мальдывы: гэта падатковы рай, дзе для ўплаты аднаго падатку (9,3% даходу) кампаніі неабходна патраціць менш чым гадзіну ў год. У дваццатку найлепшых уваходзяць ААЭ, Ірландыя, Швейцарыя, Новая Зеландыя, Данія і Нарвегія. У ліку найгоршых дваццаці краін — Балівія, Венесуэла, Кітай, Алжыр, Украіна і Беларусь. Беларусь, на думку аўтараў даклада, мае самую заблытаную падатковую сістэму, па колькасці плацяжоў лідзіруе Узбекістан (130), па часавых затратах — Бразілія (2600 гадзін), а падатковы цяжар найвышэйшы ў Гамбіі — 291,4% прыбытку.

У Беларусі кампаніі абавязаны заплаціць 125 плацяжоў. Нягледзячы на льготы, зборы складаюць 186% прыбытку, а на іх уплату неабходна 1188 гадзін у год. Пры гэтым расійскія кампаніі абавязаны плаціць 23 падаткі, што складаюць 54,2% прыбытку. Галоўнай праблемай падатковай сістэмы Расіі аўтары даклада лічаць бюракратыю.

Аляксей АРЭШКА.

Бізнес — у малыя гарады

У Беларусі распрацаваны нарматыўныя дакументы для стварэння ўмоў развіцця бізнесу ў малых і сярэдніх гарадах краіны.

Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Савета міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, перадаюць афіцыйныя крыніцы.

Паводле слоў А.Кабякова, распрацаваны праект дакумента аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання прадпрыемстваў. Плануецца, што перайсці на спрошчаную сістэму змогуць арганізацыі з колькасцю да 100 чалавек, выручка якіх за год не перавышае 2 млрд рублёў. Ільготы прадугледжаны і для іншых прадпрыемстваў у такіх гарадах.

Распрацаваны дакумент, які ўтрымлівае меры па стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі асобных тавараў. Ён уключае пералік тавараў, вытворчасць якіх можа ажыццяўляцца з дзяржпадтрымкай, а таксама для выпуску якіх сыравіна, матэрыялы, камплектуючыя і абсталяванне, што ўвозяцца на мытную тэрыторыю Беларусі, будуць вызваляцца ад абкладання мытнымі пошлінамі. Акрамя таго, распрацаваны праект дакумента аб мерах па ўцягванні ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

А.Кабякоў адзначыў, што развіццё рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадоў у 2006—2010 гадах будзе ажыццяўляцца шляхам аказання дзяржпадтрымкі дзейным арганізацыям, павышэння канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў у такіх населеных пунктах, а таксама стварэння ўмоў для развіцця малога бізнесу.

Праект праграмы развіцця рэгіёнаў малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2006—2010 годы ахоплівае 187 населеных пунктаў, 86 з якіх праблемныя. Плануецца, што ў кожным уключаным у праграму гарадскім пасяленні будуць рэалізоўвацца інвестыцыйныя праекты. Усяго іх будзе ажыццёўлена больш за тысячу, у тым ліку найважнейшых — 344. За пяць гадоў у малых і сярэдніх гарадах краіны будзе дадаткова створана 105 тыс. новых працоўных месцаў.

Марына НОСАВА.

БИЗНЕС

Александр ПОТУПА, профессор:

«Страну спасет предпринимательство»



Директивой №2, подписанной Александром Лукашенко 27 декабря 2006 года "О мерах по дальнейшей дебюрократизации государственного аппарата", мог быть совершенно иной документ: проект нормативного акта "О системных мерах по стимулированию развития предпринимательства". Белорусский союз предпринимателей (БСП), пробивающий документ порядка трех лет, отложил свои надежды на подписание директивы на январь 2007 года. *"Какая разница? Надеялись, что это будет директива №2, пускай будет директива №3. Лишь бы приняли",* — утверждает председатель БСП **Александр ПОТУПА.**

За констатацией "чрезвычайного" положения в сфере предпринимательства следует признание необходимым законодательного закрепления *"приоритетного развития предпринимательства в регионах, в малых и средних городских поселениях; стимулирования роста объемов производимых субъектами предпринимательства товаров и повышения их качества; упрощения порядка налогообложения; вовлечение в хозяйственный оборот субъектами предпринимательства, находящегося в государственной собственности неиспользуемого имущества; оказания субъектам малого предпринимательства государственной финансовой поддержки".*

Суть документа сводится к одной-единственной установке, адресованной чиновничьей вертикали: *"Руководители местных исполнительных и распорядительных органов... несут персональную ответственность за выполнение показателей развития предпринимательства, предусмотренных программами социально-экономического развития городов и поселков городского типа".* Если до чиновничества будет доведен конкретный план по развитию предпринимательства, они самостоятельно сметут все барьеры для достижения поставленной задачи, которые, впрочем, сами же и устанавливают.

Реальные правовые условия в Беларуси вынуждают предпринимательские структуры согласиться даже с таким обтекаемым текстом директивы, за которой должен последовать *"хвост неких сопровождающих документов".* При соблюдении трех условий.

Первое: на законодательном уровне должно быть закреплено, что развитие предпринимательства является одним из приоритетов государственной политики.

Второе: директива должна дать четкую установку на трехкратное увеличение количества малых предприятий. Сейчас в Беларуси на тысячу жителей приходятся три малые предприятия, в то время как в России этот показатель достиг уже 7 на тысячу. Москва взяла курс на трехкратное увеличение количества малых предприятий, а потому и белорусским властям следовало бы сделать то же самое. *"Если директива даст установку на трехкратный рост, чиновники начнут сами снимать все чинимые до сих пор препятствия. Иначе машина никак не поедет",* — полагает А.Потупа.

Конкретизация параметра роста количества малых предприятий, полагает глава БСП, учитывает опыт российского правительства, которое официально поставило задачу о трехкратном росте количества малых предприятий в РФ, стремясь довести их уровень примерно до 20 МП на 1000 человек населения (ныне в РФ примерно 7 МП на 1000 человек населения). Для Беларуси, где соответствующий параметр 3 МП на 1000 человек населения, данная проблема еще более актуальна; решение проблемы ускорит интенсивно обсуждавшуюся в 2005—2006 годах более детальную классификацию предприятий с учетом микроорганизаций, что в свою очередь откроет дорогу для переходов значительной части индивидуальных предпринимателей в корпоративный бизнес.

В директиве должно содержаться также четкое указание на приоритетность инновационного развития.

27 декабря Александр Потупа направил ряд конкретных предложений на имя премьер-министра Сергея Сидорского и главы президентской Администрации Геннадия Невыгласа. В развитие еще неродившейся директивы председатель БСП предлагает чиновникам для ознакомления проект декрета президента. А.Потупа считает проект декрета *"особо важным для интенсификации инвестиционного процесса в стране".*

БСП вносит достаточно интересные предложения. К примеру: *"все неустранимые сомнения, противоречия и неясности в нормативных правовых актах, касающихся прав и обязанностей субъектов предпринимательской деятельности, толкуются в пользу последних до получения по ним официальных разъяснений в порядке, определенном законодательством".* Как в суде: все сомнения толкуются в пользу обвиняемого.

Союз предпринимателей предлагает ввести *"адаптационный период"* сроком не менее трех месяцев. То есть все нормативные акты, ухудшающие или ужесточающие условия работы субъектов предпринимательства, начинают действовать не раньше, чем через три месяца после публикации.

Следует обратить внимание и еще на одну идею. *"Органам государственной власти запрещается создание коммерческих организаций и хозрасчетных структур с целью передачи им функций и прав органов государственного управления".*

Ни больше и ни меньше. *"Сложилась критическая ситуация. В случае ценового скачка по энергопоставкам себестоимость экономики вырастет. В условиях экономических санкций со стороны Европы, в связи с похолоданием в белорусско-российских отношениях мы можем рассчитывать только на либерализацию экономики. Есть еще один вариант: завинчивание гаек, то есть государство может уничтожить все, что еще шевелится... Можно подавить все живое и устроить классический социализм. Развитие предпринимательства в известном смысле спасет экономику",* — убежден Александр Потупа.

Глеб ХМЕЛЬНИЦКИЙ.

УВАГА!

Вы не забыліся пра дэкларацыю?

У сувязі з пачаткам кампаніі па падачы дэкларацый аб даходах фізічных асобаў за 2006 год у рэжым працы падатковых інспекцый Мінска ўнесены змяненні.

Дэкларацыі, нагадаем, павінны падаць грамадзяне, якія мелі ў 2006 годзе даходы больш як з адной крыніцы. Дэкларацыі падаюцца ў падатковыя інспекцыі па месцы жыхарства па 1 сакавіка.

Як паведамілі БелаПАН у інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінску, да 19 студзеня раённыя інспекцыі будуць працаваць: у панядзелак, аўторак, чацвер і пятніцу — з 8.45 да 18.00; у сераду — з 8.45 да 20.00. З 20 студзеня па 11 лютага графік працы будзе наступным: панядзелак, аўторак, чацвер, пятніца — з 8.45 да 18.00; серада — з 8.45 да 20.00; субота — з 9.00 да 13.00. З 12 лютага па 1 сакавіка раённыя падатковыя інспекцыі будуць працаваць па панядзелках, аўторках, сярадах і пятніцах з 8.45 да 20.00; па суботах і нядзелях — з 9.00 да 15.00.

Марына НОСАВА.

ВЕРИТЬ-НЕ ВЕРИТЬ

Со старой свиньей в новый год …

Если брать Восточный календарь, то 2007 год станет для Беларуси первым годом Свиньи в XXI веке. В прошлом столетии наша страна пережила восемь свинских периодов — 1911, 1923, 1935, 1947, 1959, 1971, 1983 и 1995. С точки зрения истории, может быть, они не так значимы.

Но анализ отдельных событий, которые происходили в эти годы, приводит к весьма и весьма любопытным обобщениям, часть из которых можно даже спроецировать и на первый год Свиньи в Беларуси в XXI веке.

Первое, что сразу бросается в глаза, — это проведение в Беларуси в год Свиньи глобальных денежных реформ. 1923 год — это апогей знаменитой денежной реформы наркома финансов Сокольникова, в результате которой был введен в обращение свободно конвертируемый советский червонец. В рамках реформы в 1923 году была проведена первая в истории Беларуси деноминация. Тогда денежные знаки образца 1922 года заменили совзнаками из расчета 1 новый к 100 старым рублям. В 1947 году в Советском Союзе и БССР проводится новая денежная реформа. Ее инициатор, глава финансового ведомства СССР Зайцев, заменяет старые денежные знаки на новые из расчета 1 к 10 рублям. Причем тогда заработная плата рабочих и служащих, доходы крестьян от государственных заготовок и другие трудовые доходы всех слоев населения были сохранены в прежних размерах в новых деньгах. Трудно сказать, будет ли в наступающем году Свиньи соблюдена эта историческая преемственность, но, если помните, обсуждение возможной деноминации нынешнего белорусского рубля активно велось весь 2006 год. И хотя Нацбанк опроверг возможность деноминации в обозримом будущем, древние знания, как видите, указывают на обратное.

Если верить "свинскому опыту", то в 2007 году в Беларуси должны произойти изменения в землепользовании, законодательстве о земле или что-либо другое, связанное с землей. Опять вернемся назад. 1911 год — пик столыпинской реформы в белорусских губерниях, приведшей к появлению хуторов и росту благосостояния землепашцев; 1923 год — принятие Земельного кодекса БССР, по которому вся земля была национализирована; 1935 год — апогей коллективизации в Восточной Беларуси, за который в колхозы были загнаны рекордные 106,4 тыс. крестьянских дворов; 1947 год — начало коллективизации и раскулачивания в Западной Беларуси. Трудно сказать, что должно произойти с землей в следующем году. Но, с другой стороны, может быть, и ходить далеко не надо: как намечено главой государства и правительством, в 2007 году продолжится "успешное претворение в жизнь" политики "агрогородизации" сельского населения Беларуси. Ударим по хуторам Столыпина агрогородками Лукашенко!

Если копнуть еще глубже, то можно провести аналогии и с политическим развитием современной Беларуси. Правда, тут аналогии неустойчивые, история в те или иные интересующие нас временные промежутки сильно разнится. С одной стороны, в 1923 году ЦИК БССР объявляет амнистию "участникам антисоветских националистических организаций". Благодаря ей в Беларусь вернулась из-за границы интеллигенция, которая стала движущей силой национального возрождения страны в середине и конце 1920-х годов. С другой — в 1947 году отряды милиции и спецназа приступают к решительному наступлению на оплоты бандитизма — белорусских "зеленых братьев".

Можно задаться вопросом (что весьма интересно сейчас, в разгар выяснения отношений между Россией и Беларусью): а что пророчит год Свиньи нынешним союзникам, будут ли они друг другу и дальше подкладывать свинью? Надо сказать, если обратиться к прошлому, то 2007-й как год Свиньи для нашей страны обещает мало что хорошего. Именно с 1923 года руководство БССР, до этого более-менее независимое в своей внутренней и внешней политике, отдает бразды правления Москве. Показательный пример. В 1923 году начинается процесс централизации экспорта, Москва ликвидирует независимость республиканских органов власти в проведении внешней политики и направляет все экспортные поступления в центральную кассу. Как, собственно говоря, она пытается сделать и сейчас, лишая Минск нефтяных и газовых льгот, а может быть, и политической независимости.

Михаил РАДКЕВИЧ,
"Ежедневник".

СЕКРЕТЫ УСПЕХА

Бизнес по-американски: в чем его преимущества?

В Германии компании из США работают в два раза эффективнее немецких фирм. В области бизнеса американцам как не было, так и нет равных. Об этом свидетельствуют результаты исследования, проведенного дюссельдорфским филиалом нью-йоркской консалтинговой фирмы Droege & Co и обнародованные радио "Немецкая волна". Несомненно, они представляют интерес и для белорусских читателей.

Главным отличием американского подхода к бизнесу от немецкого и вообще европейского оказалось более последовательное подчинение всей деятельности фирм принципу достижения максимальной прибыли для держателей акций. Другая интересная особенность "бизнеса по-американски" в Германии — кадровая политика. *"На американских предприятиях и их дочерних фирмах в Германии работает в общей сложности около 800 тысяч человек, что составляет 2 процента здешнего рынка труда. Причем интересно отметить, что подавляющее большинство сотрудников, включая высшие эшелоны менеджмента этих фирм, — немцы. Так было не всегда, но опыт последних лет показал, что филиал американской фирмы в Германии работает более эффективно, если его возглавляет местный житель. Связано это с серьезными различиями культур предпринимательства",* — мнение одного из авторов исследования.

В Германии социальная защищенность трудящихся, практически гарантируемая государством, ставится чуть ли не выше прибыльности компании. Это в корне противоречит так называемой американской мечте — карьере от мойщика посуды до миллионера, которая требует несгибаемой воли, стойкости, готовности рисковать и личной ответственности за свое материальное благополучие.

Следующее принципиальное отличие бизнеса по-американски — более высокая заинтересованность сотрудников в коммерческом успехе фирмы. Результаты опроса показали, что американским фирмам, работающим в Германии, удается заразить таким вот "американским" отношением к общему делу и свой немецкий персонал. Более того, секрет успеха как раз и заключается в том, чтобы, приняв немецкие правила игры, продолжать работать "по-американски".

Тот, кто работает "по-американски", в гораздо большей степени вовлечен в процесс принятия важных решений и чувствует свою ответственность за общий успех. А это, в частности, отражается и на отношениях с клиентами, что обеспечивает более высокий уровень сервиса, чем и отличаются от своих европейских конкурентов американские фирмы.

Так вось проста: пішам і ўступаем. Без лішніх слоў і абяцанняў. У сэнсе паступіў загад і разнарадка — кропка. Трэба выконваць, каму? Кабеце, каму ж яшчэ? А студэнты? А студэнты — нічога, у іх загад-прапанова пытанняў не выклікала. Усе заявы напісалі. Апрача Максіма...

Потым у майго знаёмага была "акадэмка", да вучобы ён прыступіў сёлетняй восенню. І сітуацыя паўтарылася. Праўда, з нюансамі. Скажам, уступаць у БРСМ загадвалі-заклікалі нават выкладчыкі. Ну, вы разумееце, патрэбна масавасць.

У ліку пікантных нюансаў былі і такія. Напрыклад, БРСМ абяцаў дапамагчы ў працаўладкаванні. А таксама рэгулярна арганізоўваць "культпаходы" на канцэрты. І што? Максім пракаменціраваў.

— З мінулага выпуску ўладкаваўся толькі адзін. Дый тое, усе ведаюць, бацька ўзяў у сваю фірму. А канцэрты... Ну, божа мой, тыя канцэрты, куды ніхто не пойдзе, і дзе трэба масоўка. На "Metallica" нас бы не павялі, у БРСМ грошай не хопіць...

Гэта так, не хопіць. Аляксандр Рыгоравіч, відаць, не вельмі шчодра спансіруе свой "гітлерюгенд". Ёсць праблемы больш неадкладныя. Напрыклад, газ і яго кошт. Калі разлуецца патэнцыяльны электарат (а ён немінуча разлуецца), то на задачы падрыхтоўкі падрастаючай змены прыйдзецца аператыўна забыцца.

Дый няма змены. У групе Максіма 27 чалавек. Большасць успрыняла прапанову ўступіць у БРСМ проста абыякава: ну, трэба вам — атрымайце. Але трое адмовіліся катэгарычна і публічна. Гэта, так бы мовіць, ужо грамадзяне, якія сфарміраваліся. Астатнія — напаўграмадзяне. Таму што, з аднаго боку, яны не адмовіліся, з другога — ім усё роўна куды было ўступаць: ці то ў партыю падтрымкі "маленькага зялёнага вусеня", ці то ў падтрымку маленькага народу манегаскаў, якія жывуць у княстве Манака і не маюць права гуляць у казіно Монтэ-Карла. Па законе, заўважце.

Сам Максім вельмі рваўся на Кастрычніцкую плошчу падчас выбараў. Ды бацькі не пусцілі пад пагрозай прымянення фізічнай сілы. Максім скарыўся. А потым збег. Ды толькі плошча імя Калініноўскага ўжо ператварылася зноў у Кастрычніцкую. Максім крыху спазніўся: бацькі затрымалі.

"Бацькі затрымалі...", — вам не здаецца, што гэта фраза з'яўляецца ключавой?

...Аднак трэба заканчваць. Вось вы бачыце перад сабою "фірменны" бланк для ўступлення ў БРСМ. Вам не здаецца, што гэта пачатак хваробы, хваробы старых людзей — маразму? Няма ўжо нічога, няма — ні СССР, ні КПСС, ні ВЛКСМ. Нічога. Тым не менш нам прапануюць жыць у такіх абставінах.

І мы жывём. Машына часу працуе. Яна не ёсць ілюзія. Яна, на жаль, суцэльная рэальнасць.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Самые популярные имена — Анастасия и Никита

В Минске женское имя Анастасия в 2003—2005 годах является абсолютным лидером при регистрации новорожденных. Как сообщили в Мингорисполкоме, в 2005 году такое имя родители дали 599 новорожденным девочкам, в 2004-м — 750, 2003-м — 712. Второе и третье места по популярности за указанный период занимают Мария, Дарья и Анна.

Лидерство среди мужских имен удерживает Никита — в 2005 году в столице появилось 526 мальчиков с таким именем, в 2004-м — 530. Особой популярностью у горожан пользуются имена Владислав и Алексей. Также родители отдают предпочтение именам Михаил и Кирилл.

Что касается сроков появления на свет малышей, то пик рождаемости (от 1,4 тыс. до 1,6 тыс.) приходится в столице на летние месяцы — июнь, июль, август, сообщает БЕЛТА.

ЗДАРЭННЕ

Пад Віцебскам абрынуўся недабудаваны мост

Чалавечых ахвяр няма, але незавершаны аб'ект ужо не падлягае аднаўленню. Паводле папярэдніх высноў, страты ў грашовым вымярэнні складаюць каля васьмі мільярдаў рублёў.

Дзеля высвятлення прычын аварыі створана адмысловая камісія, разбірацца з прычынамі здарэння ў Віцебск ужо прыязджаў міністр транспарту і камунікацый Уладзімір Сасноўскі.

Спачатку спецыялісты заўважылі дэфармацыю моста, але праз пару гадзін ён практычна абрынуўся ў Заходнюю Дзвіну.

Як нам паведамілі віцебскія калегі, мост у раёне вёскі Камары Віцебскага раёна планавалі здаць да чарговага "Славянскага базару" — у ліпені 2007 года. Ён мусіў стаць часткай кальцавой дарогі, якая цяпер будуецца вакол абласнога цэнтра. Паводле звестак, атрыманых Радыё Свабода ад будаўнікоў, мост узводзіўся па тэхналогіі, якая апрабоўвалася на Беларусі ўпершыню. Апрача Віцебска, ужо была распачата падрыхтоўка да будаўніцтва падобнага моста ў Верхнядзвінску, потым па такой самай тэхналогіі меркавалася пабудаваць мост на Гомельшчыне. Аднак пасля надзвычайнага здарэння, афіцыйнай мовай апісанага як "самаадвольная дэфармацыя канструктыўнага элементу", лёс і гэтага, і падобных збудаванняў застаецца нявырашаным.

Алег СНОЎ.

АБРАКАДАБРА

«Алименты» для убийцы

Их выплачивает житель Крупок Виталий Байдак. Ежемесячно у него высчитывают из зарплаты 20 процентов, которые идут на содержание нелюдя, лишившего жизни двух престарелых человек из-за иконы и нескольких тысяч рублей

Из газеты "Борисовские новости". *(статья "Убийство на почве судебной ошибки?"):*

"Похоже, общественность Крупок пребывает в шоке: в деревне Новая Крупка пару недель назад совершено два убийства. Милицией в розыск объявлен Громенков.

Это преступление ужасно тем, что оно стало следствием зловещей цепи ошибок судебных и правоохранительных органов. На них указывала наша газета в судебном очерке "Приговор нельзя признать законным и обоснованным".

Гражданин Громенков после драки со своим ровесником — жителем Крупок Байдаком — 13 мая 2002 года сумел оговорить последнего в глазах правосудия. Приговором суда Крупского района Виталий Байдак признан виновным в совершении преступлений, и ему было назначено наказание в виде лишения свободы на пять лет с отбыванием срока в колонии усиленного режима. Осуждение Байдака сопровождалось, по мнению правозащитников, многочисленными нарушениями в действиях работников милиции, суда, прокуратуры и адвокатуры. При объективном разбирательстве на скамье подсудимых мог оказаться не Байдак, а Громенков. Тогда, возможно, не случилось бы двух убийств".

Из заявления Валентины Байдак:

"Крупским судом не учитывалась личность Громенкова. Громенков А.П. в январе 1999 года совершил побег из части Крупки-2, вскрыв сейф и похитив из него солдатские деньги в сумме 7.000.000 рублей. Во время прохождения срочной службы в Новополоцке — был отправлен в эту часть после побега, — состоял в группировке, занимавшейся воровством сахара из вагонов. Чувствуя безнаказанность, нигде не работающий Громенков за семилетний период преступной деятельности совершает ряд краж на территории Крупского района. А 15 ноября 2005 года уже не ограничивается только кражей, а совершает убийство двух человек с особой жестокостью (перерезает горло женщине от уха до уха, а мужчине наносит семнадцать ударов, тщательно запутывая следы). И опять в камеру ИВС попадают невинные люди, один из них после этого умирает. И только когда под подозрение попадают родственники убитых Александровых, только тогда соседка Л.Мороз на поминках вспоминает, что видела Громенкова накануне убийства... Судебная ошибка при расследовании уголовного дела в 2003 году стоила жизни двум человекам, а также сломала судьбу моего сына..."

Но, судя по многочисленным ответам, которые получила Валентина Александровна (мать Виталия Байдака) из высших инстанций, там так не считают. Там и по сей день не сомневаются в виновности ее сына, говоря, что приговор был законным и справедливым. Даже "алименты" убийце не смутили ни одного именитого правоведа.

Я беседовал на эту тему с заместителем председателя Верховного суда **Валерием КАЛИНКОВИЧЕМ**. И Валерий Леонидович ответил так:

— Мне мать жаль, а не сына. Она из-за него столько горя хлебнула. А Виталий Байдак получил то, что заслужил. Мы три раза проверяли это дело, разные люди знакомились с ним, а вывод один: бил он человека, пьяным угонял "уазик" и слетел в кювет.

А то, что из его зарплаты высчитывают сегодня деньги... Так не надо бить по голове даже злостного преступника. Бил, нанес увечья, так отвечай по закону и заплати. Заплати за лечение, за нанесенный ущерб здоровью. Только так.

Я тоже не хочу идеализировать Виталия Байдака. Одна дружба с преступником Громенковым, пусть и двухмесячная, вызывает ряд вопросов. И не случайно он попал в поле зрения крупской милиции.

Но как нельзя бить по голове даже злостных преступников, так нельзя и выбивать из задержанных ложные признания, вешать на них то, что они не совершали. И, вынося суровый приговор, не надо оставлять вопросов, на которые ни мать, ни правозащитники не получили ответов.

Из рассказа правозащитника Андрея Демидовича:

— Я хорошо знаком с этим делом, выезжал много раз в Крупки. Да, Громенков и Байдак дружили одно время. Но однажды в доме Виталия исчезла большая сумма денег и паспорт. Кто сделал это, он не сомневался, хотя приятель все отрицал. Тогда Байдак написал заявление в милицию, а там к заявлению отнеслись не должным образом. Поспрашивали — и все. Конечно же Виталий затаил обиду. И она прорвалась в тот злополучный вечер. Хочу особо отметить, что участие в потасовке принимал не только Байдак. С ним шли Филимонов и Васюкова. А у тех тоже были претензии к Громенкову, особенно у Васюковой. Она даже не отрицала, что нанесла пару ударов туфелькой по голове обидчика. Но чьи удары были основными, причинившими вред здоровью, вопрос остался неисследованным. Куда-то "исчез" Филимонов, не заинтересовалось следствие Васюковой, давшей противоречивые показания. Крайним оказался Байдак. Хотя, я думаю, да и не только я: эти тяжкие телесные повреждения мог нанести себе и Громенков: он ведь был изрядно пьян. А может, еще кто-то встретился ему на пути. Ведь драка произошла в полночь, а его подобрали в восемь утра. И недругов у него хватало.

— Андрей Валентинович, почему крайним оказался Виталий Байдак? Почему у милиции была предвзятость к еще молодому и не засветившемуся человеку?

— Есть мотив. И довольно серьезный. Год назад парня обвинили в совершении какого-то преступления, судили, вынесли приговор. Но Минский областной суд усомнился в нем. Виталия оправдали, а дело это прекратили. Естественно, такое не остается безнаказанным для органов, для тех, кто расследовал сомнительное дело. А расследовала его крупская милиция, крупский прокурор поддерживал обвинение в суде. Так что в 2002 году появился удобный случай, чтобы "расквитаться" за свое унижение и реабилитировать себя.

Из газеты "Борисовские новости" за 10—15 февраля 2005 года:

"Во-первых, Байдак В.А. виновным себя не признал. Во-вторых, его утверждение о том, что в ходе предварительного следствия он себя оговорил под воздействием физического и психологического давления со стороны работников милиции, суд считает надуманным, ложными данными с целью уйти от ответственности за содеянное".

— Тогда как объяснить тот факт, что Байдак сознался и в угоне мотоцикла? — возмущается правозащитник Андрей Демидович. — Но на суде это обвинение рассыпалось. Даже суд усомнился в нем.

— Но суд не усомнился, что он угнал автомобиль и разбил его.

— А где доказательства? В суде был приобщен табель рабочего времени по месту работы обвиняемого. Из него видно, что Байдак весь день находился на рабочем месте. Именно в тот день, когда был совершен угон, и произошло ДТП. А то, что пришел милиционер на производство и не нашел Виталия, это ни о чем не говорит. Мог тот на минуту отлучиться по личной нужде? Мог.

Но больше всего масла в огонь подлила мать Виталия Байдака своей неугомонной борьбой за сына. Причем приемного сына. Около 30 лет назад Валентина Александровна взяла в свой дом болезненного мальчика из Борисова. И с тех пор он стал смыслом ее жизни, ради него она, как горьковская мать, готова на все. И в этом уже убедились крупские пинкертоны, объявив женщину чуть ли не террористкой. А "террористка", видя несправедливость, не молчала, а действовала.

Из газеты "Борисовские новости":

"Даже нанятый адвокат Е. Крепская, по мнению матери, больше действовала в интересах следствия и обвинения. Адвокат замужем за милиционером, который арестовывал Виталия в тот злополучный день. Действия дознателя В.Крепского без устали оспариваются Валентиной Александровной".

В последующей дуэли между матерью и адвокатом победила Байдак. Даже крупский суд не стал на защиту Е.Крепской, когда та обвинила Валентину Александровну в том, что она обзывала ее "тварью". Поставила мать на место и прокурора Крупского района И.Т.Дашука. И он за "неудовлетворительное разрешение обращений граждан", в том числе и Байдак, "привлечен к дисциплинарной ответственности и понижен в должности". Досталось и еще одному обидчику. "По результатам проверки принято решение: за систематическое нарушение служебной дисциплины, игнорирование требований приказа МВД Республики Беларусь, выразившееся в безответственном поведении при проведении проверки по Вашим заявлениям, совершении действий, подрывающих авторитет органов внутренних дел, старшего лейтенанта милиции Голубева В.А. из органов внутренних дел уволить".

Я это привожу не для того, чтобы показать "непримиримость" Валентины Байдак, а чтобы документами подтвердить: были в Крупках, а может, и еще есть те, кто подрывал авторитет органов, кто неудовлетворительно работал с обращениями граждан и разрешал их, кто вопреки статусу действовал в интересах следствия и обвинения.

И я понимаю мать, которая стучится теперь во все двери. Она не хочет чьих-то увольнений и понижений. Она просто не понимает, почему ее сын должен содержать убийцу. Доводы Верховного суда сердце матери не приняло. Не поняла Валентина Александровна и тех белорусских парламентариев, которые посоветовали ей собрать 50 тысяч подписей и через депутата округа вынести свой вопрос на рассмотрение законодателей. Но больше всего Байдак возмутило отношение сотрудников Администрации президента Республики Беларусь, которые, не читая, возвращают ее письма и телеграммы. Обиженная мать села и написала письмо Владимиру Путину.

— Сын мой вернулся из колонии в августе 2005 года, — рассказывает Валентина Александровна, — и почти до ноября его не трогали, он ничего не платил. И только я пошла с документами в соответствующие инстанции, в том числе и в Администрацию президента Республики Беларусь, чтобы помогли снять с Виталия все обвинения, как сразу пришел иск. Сын получил в ноябре 350 тысяч рублей. Он сварщик, но работает в системе Агропрома, где зарплаты всегда маленькие, и у него удержали 90 тысяч. Как за оставшиеся копейки прокормить жену с двумя детишками? Буду голодать, отдавать ему свою жалкую пенсию. А что делать? Вот я и попросила в письме Владимира Путина: помогите моей семье, чтобы она была в новом году с хлебом, ибо до нашего президента я никак не могу достучаться.

Достучится, не достучится Валентина Байдак — трудно сказать. Но вопрос, поднимаемый ею, актуальный. Это не единственный случай, когда граждане выплачивали или выплачивают "алименты" на содержание преступников. И разум такую практику не приемлет.

Евгений СОЛОВЬЕВ.

СВАБОДА СЛОВА

«Голас Радзімы» з «Советской Белоруссии»

Да 2010 года ўсе датацыйныя мас-медыя будуць далучаны да больш моцных партнёраў або ліквідаваныя ўвогуле. Першай ахвярай на шляху да рэалізацыі гэтых планаў стала газета "Голас Радзімы", якая спыняе самастойнае існаванне: з пачатку 2007 года выданне мяркуе выходзіць як чатырохпалосны дадатак да ўсюдыснай "Советской Белоруссии"."Голас Радзімы" далучаецца да "СБ" разам з часопісам "Belarus" і газетай The Minsk times.

У рэдакцыйнай перадавіцы "Час перамен", змешчанай у нумары ад 7 снежня 2006 года, гаворыцца: *"З 1 студзеня 2007 года "Голас Радзімы" разам з газетай "The Minsk times" і часопісам "Belarus" увойдзе ў інфармацыйны холдынг пры рэдакцыі газеты "Советская Белоруссия" — "Беларусь сегодня", што дазволіць зрабіць выданне для замежных чытачоў больш цікавым і інфармацыйна насычаным. Як Вы ўжо ведаеце, бясплатная рассылка газеты ліквідавана, але газету можна атрымліваць сучасным, цывілізаваным спосабам — праз падпіску. Чым больш падпісчыкаў будзе ў газеты, тым больш шанцаў, што "Голас Радзімы" акрыяе ў новых умовах, а не ператворыцца ў дадатак".*

Былая рэдактарка газеты **Наталля Салук** гаворыць, што рашэнне выдаваць "Голас Радзімы" ў якасці чатырохпалоснага дадатку да газеты "Советская Белоруссия" прыняў прэзідыум прэзідэнцкай Адміністрацыі яшчэ летам 2006 года. У планах афіцыйнага Мінска да 2010 года ўсе датацыйныя мас-медыя альбо ліквідаваць, альбо далучыць да больш моцных СМІ.

"Прадуманай схемы далейшага існавання ці канкрэтных планаў няма. Пры "Советской Белоруссии" будзе выдавацца як чатырохпалосны дадатак, магчыма, у колеры, як і цяпер", — сказала "Народнай волі" экс-рэдактар Наталля Салук, якая на момант гутаркі здавала справы, — газетай журналістка кіравала з 1999 года. Некалькі маладых журналістаў дый патрыярх беларушчыны Адам Мальдзіс перайшлі пад новы дах.

"Газета была на пад'ёме, інтэнсіўней развівалася. Існуе інтэрнет-версія газеты, якая таксама развівалася. За апошні нумар Нацыянальная камісія ЮНЕСКА ўручыла нам ганаровы дыплом за распаўсюджванне інфармацыі пра ЮНЕСКА. Выданне развівалася. Што будзе цяпер -ніхто не ведае", — падкрэсліла Наталля Салук.

Былая рэдактарка хвалюецца за беларускіх падпісчыкаў, за тое, ці змогуць яны атрымліваць газету хоць бы ў ранейшым аб'ёме. Зрэшты, хвалюйся не хвалюйся, далучэнне адбылося.

Сама Наталля Салук апынулася без працы. *"Мне сказалі: з вамі будзе асобная размова. Калі, пра што — невядома. Пакуль я здаю справы. Мяне мала турбуе, што я фактычна засталася беспрацоўнай. Узрост"*, — кажа журналістка.

Абавязкі рэдактара выконвае Ларыса Сагановіч.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ДАВЕДКА

Газета "Голас Радзімы" — дзяржаўнае выданне, арыентаванае на чытачоў, якія жывуць за межамі краіны, галоўным чынам на беларускую дыяспару як у дзяржавах СНД, так і ў далёкім замежжы. Па афіцыйных даных, сёння за межамі Беларусі пражывае каля трох мільёнаў беларусаў.

Штотыднёвік выдаецца з 1955 года. Распаўсюджваецца ў 48 краінах свету, у тым ліку ў ЗША, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Польшчы, Эстоніі, Літве, Аргенціне, Ізраілі і г.д.

Выдаецца на беларускай мове. Мае рускамоўныя дадаткі: "Диалог" (выходзіць у Ізраілі) і "Беларусь в Молдове" (сумесна з урадавай газетай "Независимая Молдова"), існуюць дамовы аб інфармацыйным абмене з газетамі "Беларусь в Калининграде" (Россия) і "Инфоцентр" (The Voice of Russion — Speakers and Irland) у Ірландыі.

Дасюль "Голас Радзімы" выходзіў на 16 палосах два разы на месяц (спаранымі нумарамі), у колеры.

Год Свінні распачынаецца свінствам

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь вырашыла зрабіць унёску ў маючае адбыцца ў наступным годзе святкаванне юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Па замове згаданага міністэрства выдадзены адмысловы перакідны каляндар. На абгортцы календара выявы помніка Якубу Коласу ў Мінску, да якога мы даўно прызвычаіліся, і помнік Янку Купалу, што сёлета пастаўлены ў Маскве. Імя мастака, аўтара графічнага праекта, не пазначана. Відаць, мастаку было сорамна за такую работу, бо дызайн, скажам шчыра, даволі безгустоўны.

Паколькі надпісы "Перакідны каляндар", "125 гадоў з дня нараджэння" (не напісана каго) і ўсе выходныя даныя на беларускай мове, пакупнік упэўнены, што набывае беларускамоўнае выданне. Зняўшы абгортку, ён спачатку насамрэч знаходзіць чатыры старонкі на мове Песняроў — біяграфіі Купалы і Коласа, а далей — так бы мовіць, білінгвізм... Зверху "январь", знізу — "студзень". Злева "понедельник", справа — "панядзелак". Уся астатняя інфармацыя (вершы, показкі, афарызмы і гэтак далей) у календары, "прысвечаным" нашым Песнярам, — выключна на мове ўсходняга суседа. Ды і падзеі, якія згадваюцца на старонках календара, у асноўным узяты з расійскай і сусветнай гісторыі, культуры, навукі. Беларускі "каларыт" зведзены да мінімуму. Міжволі падумаеш: прычым тут увогуле Купала і Колас? Усё гэта патыхае здзекам з нашых вялікіх паэтаў. Зрэшты, гэтая прафанацыя — здзек з нас, з беларусаў. З нашай краіны, якую аўтары і замоўцы календара бессаромна трактуюць як правінцыю Расіі.

Год Свінні (па Усходнім календары) распачаўся свінствам. Пра замове Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.



Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

СКАНДАЛ

Антаніна КОШАЛЬ: «Для гэтай гімнасткі спартыўная кар'ера ўжо скончылася...»

Беларуская гімнастка Надзея ВЫСОЦКАЯ дыскваліфікавана да 31 снежня 2007 года. Такое рашэнне прыняла дысцыплінарная камісія Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі.

Допінг-проба, якую ўзялі ў спартсменкі яшчэ ў маі падчас Кубка свету па спартыўнай гімнастыцы, дала станоўчы вынік. У Высоцкай знайшлі забаронены прэпарат фурасемід. Цікава, што рашэнне аб дыскваліфікацыі было прынята яшчэ 11 лістапада, аднак грамадскасці паведамілі аб ім толькі зараз. У спартсменкі было 20 дзён, каб падаць апеляцыю.

"Ніякай апеляцыі ніхто падаваць не будзе, — паведаміла карэспандэнту "Народнай волі" дзяржтрэнер па спартыўнай гімнастыцы **Антаніна КОШАЛЬ**. — *Мы правялі папярэдняе расследаванне і высветлілі, што тут поўнасцю вінавата спартсменка. Фурасемід прадаецца ў кожнай аптэцы, гэта мачагонны сродак. Фурасемід — ніякі не допінг, ад яго спрытнейшым не станеш. А вось для пахудзення выкарыстоўваецца. Так і атрымалася, што дзяўчынка вырашыла такім чынам скінуць кілаграм-другі вагі. Усе спартсменкі ведаюць, што гэты прэпарат ужываць нельга, што ён забаронены. Мы ўжо і каралі за яго ўжыванне, і па руках білі — усё роўна... Кожны думае, што яго допінг-кантроль абыдзе бокам. Надзея вельмі моцна пакарала сама сябе — і штраф заплаціла, і дыскваліфікацыю атрымала. Для яе кар'ера ў спартыўнай гімнастыцы, па сутнасці, ужо скончылася. У нашым відзе спорту год прастою — гэта фініш. Зараз дзяўчынка заканчвае школу, разумненькая, рыхтуецца паступаць у ВНУ. Ускладалі мы, натуральна, на яе надзеі, перспектыўная была, аднак сама сябе і "закапала". У мінулым годзе выступала на чэмпіянаце свету, Еўропы, былі спадзяванні на будучае. І так вось атрымалася..."*

Алесь СІВЫ.

ВАКОЛ СПОРТУ

Гуляць дык гуляць!

Кіраўніцтва мадрыдскага "Рэала" выказала заклапочанасць тым, як форвард каманды Раналда адзначыў Ражаство ў Бразіліі.

Мясцовая газета паведаміла, што нападаючы затрымаўся на адной з вечарынак аж да раніцы, хоць урачы клуба прадпісалі яму выконваць распарадак дня і сачыць за сваёй вагой.

Бразілец праводзіў час у кампаніі з двума былымі ігракамі зборнай Бразіліі Рамарыо і Эдмунда, а таксама з дзвюма невядомымі дзяўчынамі.

Трагічная смерць

Напярэдадні Новага года загінуў вядомы нарвежскі лыжнік Івар Форма, які ў 1976 годзе стаў чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў у Інсбруку.

55-гадовы спартсмен катаўся на каньках і праваліўся пад лёд лясного возера. Пошукавая аперацыя скончылася тым, што цела Форма было знойдзена вадалазамі.

Як перадае нарвежскае выданне Aftenposten, лыжнік перасякаў возера, каб прыняць удзел у спаборніцтвах.

ОТКРОВЕНИЕ

Александр ГЛЕБ:

«Часто хочется уехать на необитаемый остров...»

Игрок лондонского «Арсенала» и лучший футболист Беларуси 2006 года Александр Глеб рассказал о том, собирается ли он жениться

— Может быть, кому-то и нравится повышенное внимание к своей персоне, однако меня это давно уже не прикалывает, — поведал футболист корреспонденту "Прессбола". — Часто вообще хочется уехать на необитаемый остров, чтобы никого не видеть...

— Обижаешься на людей?

— Слишком большое давление. И пресс — разговоры, советы, рекомендации, просьбы... Да и зависть, чего скрывать. "Сколько он зарабатывает? Сколько стоит его квартира? А машина? А кого он на ней возит?" Да елки-палки, если я действительно когда-нибудь соберусь жениться, то делать из этого мероприятия национального масштаба уж точно не буду. Конечно, заманчиво перекрыть движение в центре столицы, но мне жаль своих ни в чем не виноватых соотечественников, которые пострадают от этого больше всех. Лучше скромно, тихо, в кругу самых преданных друзей. Есть вещи, которые не предназначены для всех...

— Следует полагать, что свободное время ты проводишь в компании своих таких же неженатых сверстников из "Арсенала". Куда любите ходить?

— Всей командой в этом сезоне еще никуда не выходили. А так раз в две или три недели бываем небольшой компанией в каком-нибудь клубе.

— И как тебе англичанки?

— Так себе. Мы на них особенно не смотрим, просто болтаем и отдыхаем.

— То есть на иностранке ты никогда бы не женился?

— Да нет, ты что... Все-таки наши девчонки ближе и понятнее... Но все равно, считаю, надо пожить вместе и узнать друг друга как следует. Возможно, я произвожу впечатление человека легкомысленного, но люди, знающие меня, были бы очень удивлены, заяви я через две недели знакомства, что собрался жениться. Брак — это такая вещь, к которой нельзя относиться легкомысленно.

— Ты, как известный ценитель женской красоты и знаток лучших представительниц отечественного спорта, кого бы номинировал?

— Хм, надо подумать... Говоришь, самой стильной, интересной... Вид назову — художественная гимнастика... Кто любопытствует, пусть поищет. Я там многих знаю, и меня тоже. Но эта девушка просто высшая!!! Именно так — три восклицательных знака! Она поймет, что я имею в виду.

— А в соответствующей мужской номинации ты назовешь себя?..

— Отнюдь, есть люди более достойные. От нашей футбольной сборной выставляю Юрия Иосифовича Пунтуса *(главный тренер сборной Беларуси по футболу)*. Он, конечно, опять скажет, что Глеб пошутил, но я серьезен, как никогда... И вообще, мне кажется, болельщиков гораздо больше интересует то, как я играю, чем какие-то подробности моей личной жизни. И приятно, что есть еще люди, которые могут поддержать и, что немаловажно, оценить тебя спокойно и объективно. А то иногда начитаешься всяких послематчевых мнений и комментариев и действительно начинаешь думать, что все беды в нашем футболе только от одного человека...



БЛИЦ

Что было и чего желаем

Для кого-то из спортсменов и спортивных чиновников минувший год был таким, что лучше не вспоминать, кто-то от него в восторге. Но, конечно, все мы надеемся на лучшее будущее и желаем, чтобы фортуна в год Кабана не поступила с нами по-свински.

Каким был для Вас 2006 год? Чего ожидаете от 2007-го? С такими совсем не праздными вопросами корреспондент "Народной воли" обратился к представителям спортивной общественности Беларуси.

Александр ГРИГОРОВ, министр спорта и туризма:

— 2006 год был для меня в плане работы очень напряженный, хотя и удачный. Даже зимняя Олимпиада в Турине не испортила общую картину, и Игры, пожалуй, — самое памятное событие ушедшего года. Нормальный год и по работе, и дома, хотя личной жизни за работой почти и не наблюдается... А на 2007 год у меня большие надежды — надо завоевать как можно больше лицензий и допусков к Олимпийским играм в Пекине. Это, не побоюсь сказать, будет определяющий год.

Андрей РЫБАКОВ, неоднократный чемпион Европы и мира по тяжелой атлетике:

— Чудесный был год — иначе не могу и выразиться! В 2006 году я вначале выиграл чемпионат Европы, затем сыграл свадьбу, после этого взял золото на чемпионате мира. Я, кстати, по Восточному календарю — Собака, так что хотите — верьте, хотите — нет, но что-то в этом есть. Хотя, если следовать этой логике, следующий такой же удачный год у меня будет только через 12 лет. (Смеется.) А если серьезно, то уже в следующем году собираюсь тоже достойно выступить на чемпионате мира, чтобы подтвердить олимпийскую лицензию. И, может быть, подумаем о пополнении...

Инна ЖУКОВА, неоднократная призерка чемпионатов мира по художественной гимнастике:

— Для меня все складывалось удачно, не сказала бы, что были какие-то большие неприятности. Разве можно забыть последний Кубок мира, когда я уже посчитала, что заняла 5-е место, а затем объявляют, что Инна Жукова — третья. Стою на параде, меня Алина Кабаева вытталкивает вперед, говорит: "Иди, ты "бронзу" взяла". Я там от радости чуть не обомлела! В личном плане в минувшем году у меня никаких изменений не произошло — спорт, спорт, спорт... Вот и в следующем году много работы — будет чемпионат мира, надо завоевывать лицензию на Олимпийские игры.

Виктор ЗУЕВ, боксер, серебряный призер Олимпиады-2004:

— Это был один из самых неудачных годов в моей жизни. То, что планировал, ничего не получилось. Европу "провалил", другие старты — тоже лучше не вспоминать. Да и нечего вспоминать, никаких достижений. Одним словом, не мой год. Пока как следует и не разобрался — в чем дело, много всяких нюансов. Будем надеяться, что 2007-й не будет таким паршивым, как его предшественник.

Анна БАТЮШКО, серебряная призерка Олимпиады-2004 по тяжелой атлетике:

— 2006 год был для меня самым обыкновенным годом — ничего сверхестественного не произошло. Выступила на чемпионате Европы после травмы неплохо — это плюс. В личной жизни все по-старому, замуж не вышла — это, наверное, минус. Вот на 2007-й, предолимпийский год, у меня очень большие планы. В спорте в основном. Дал бы Бог здоровья только, а то у нас травма на травме и травмой погоняет. Хорошо, что хоть залечиваются сразу же. Здоровья всем — мы его так не ценим!

Юрий ПУНТУС, главный тренер сборной Беларуси по футболу:

— Год был тяжелым и неудачным во всех отношениях — и в плане профессиональной деятельности, и в жизненном ракурсе. Но, поскольку я отношусь к жизни философски, то считаю, что она расчерчена на черно-белые полосы. Так что будем считать, что черная полоса миновала, и следующий год будет в более ярких тонах. Для сборной — никто не снимает планов, пока маячит возможность, выйти в финальную часть чемпионата мира. А себе и всем людям хочу пожелать просто здоровья!

Алесь СИВЫЙ.

СПАРТЫЎНАЯ МАЗАІКА

Нашы «засвяціліся» ва Украіне

Украінская газета "Каманда" правяла традыцыйнае апытанне, мэтай якога было вызначыць лепшага іграка ўкраінскай лігі 2006 года. Ім стаў паўабаронца днепрапятроўскага "Дняпра" Сяргей Назаранка, які набраў 304 балы. Усяго былі названы 104 футбалісты, сярод якіх два беларусы — Валянцін Бялькевіч і Арцём Чэлядзінскі. У выніку Валянцін стаў 33-м, а Арцём падзяліў месцы з 57-га па 69-е.

Стаў расіянінам

Па паведамленні расійскай газеты "Спорт-экспресс", паўабаронца нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе з самарскіх "Крыльев Советов" Дзяніс Коўба атрымаў расійскі пашпарт і з наступнага сезона не будзе лічыцца легіянерам. У мінулым сезоне футбаліст прыняў удзел у 27 матчах чэмпіянату Расіі, пры гэтым 21 раз выходзіў на поле ў стартавым складзе. З наступнага сезона ў расійскай прэм'ер-лізе на поле змогуць адначасова знаходзіцца не больш за сем футбалістаў без расійскага грамадзянства.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СКАНДАЛ

Тупік для інвалідаў-спартсменаў

У тупік чыноўніцкай абыякавасці заехалі віцебскія інваліды-калясачнікі, якія, нягледзячы на цяжкі стан здароўя, жадаюць займацца спортам і браць удзел у спаборніцтвах.

— У Віцебску няма ўмоў для трэніровак спартсменаў-калясачнікаў, — гаворыць Валерый Скрыпялёў, намеснік старшыні Віцебскага аддзялення Беларускай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў. Ён ужо шмат год працуе ў якасці трэнера з людзьмі, якія маюць хваробы апорна-рухальнага апарату, але хочуць займацца даступным для іх спортам. Раней Валерый Іванавіч займаўся валейболам з інвалідамі-калясачнікамі ў зале спартыўнага комплексу "Лакаматыў", але кіраўніцтва апошняга стала патрабаваць грошы за карыстанне залай, і гэта зрабіла заняткі немагчымымі, бо наведванне залы для інвалідаў цяпер не па кішэні. Асабістых сродкаў на арэнду памяшкання ў інвалідаў не хопіць: пенсіі ў іх мізэрныя. Ні гарадская, ні абласная арганізацыі інвалідаў грошы на развіццё фізкультурнага руху не даюць. Вось чаму рыхтавацца да наступных спартакіяд, тым больш параалімпійскіх гульняў, калясачнікам няма дзе, хоць многія з іх здольныя заваяваць медалі высокай пробы.

— Сітуацыя крыўдная, — працягвае В.Скрыпялёў. — З аднаго боку, мы часта чуем па тэлебачанні пра вялікі клопат дзяржавы аб інвалідах, а з другога — бачым нястачу гэтага клопату. Сам А.Лукашэнка пасля апошніх параалімпійскіх гульняў заявіў, што неабходна выдаткоўваць грошы для інвалідаў, якія будуць прыносіць Беларусі медалі. Аднак на спаборніцтвы грошы знайшліся, а на трэніроўкі іх няма! Няўжо каму-небудзь яшчэ не зразумела, што без трэніровак рэкордаў не бывае? Я неаднойчы звяртаўся да гарадскіх улад Віцебска з просьбай дапамагчы знайсці памяшканне для заняткаў спортам з інвалідамі-калясачнікамі. Такія залы ў горадзе ёсць, але інвалідаў туды не пускаюць. У СЭЗ "Віцебск" ёсць патрэбнае месца, але гарвыканкам не дазваляе ім карыстацца. У Мінску інвалідам-калясачнікам пашанцавала. У іх ёсць магчымасці займацца рознымі відамі спорту і нават бальнымі танцамі, па якіх, дарэчы, праводзяцца міжнародныя конкурсы сярод інвалідаў. А ў Віцебску, які нехта назваў "культурнай сталіцай", інваліды пачуваюць сябе нікому не патрэбнымі.

— Гэта крыўдна і амаральна, — хвалюецца Валерый Скрыпялёў. — Калі я спрабаваў дамовіцца аб занятках па валейболе з інвалідамі-калясачнікамі ў спортзале каледжа лёгкай прамысловасці, то ў аддзеле адукацыі гарвыканкама мне сказалі, што з'яўленне хворых людзей у навучальнай установе будзе "неэтычным"! Студэнтам гэта, маўляў, будзе псаваць настрой, абуджаць у іх песімізм.

— Карацей кажучы, — падсумаваў В.Скрыпялёў, — віцебскія інваліды-калясачнікі лічаць, што ім пакуль няма каму дзякаваць за клопат пра іх...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Для тых, хто спазніўся...

Так і ведалі: надыдзе студзень, а многія будуць тэлефанаваць: "Не паспелі зрабіць **перадаплату,** дапамажыце..."

Што ж, шаноўныя, спецыяльна для Вас у першых нумарах 2007 года друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Каб зрабіць **перадаплату** за студзеньскія, лютаўскія і сакавіцкія нумары (а можна адразу і за нумары ўсяго паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)
Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**
(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 3.01.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №